**В.В. КІВАКА**
Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

# МАРФАЛАГІЧНАЯ КАТЭГОРЫЯ ЛІКУ Ў НЯМЕЦКА-БЕЛАРУСКІХ ПЕРАКЛАДАХ

Марфалагічная катэгорыя ліку ўласціва, як у нямецкай, так і ў беларускай мове, назоўнікам, прыметнікам, займеннікам і дзеясловам. Прычым, па словах А.Л. Зелянецкага, В.В. Наважылавай, „катэгорыя ліку ў строгім сэнсе слова ёсць іменная катэгорыя, тады як у дзеяслова і прыметніка яна выступае як катэгорыя дапасаваная” [1, с. 89].

У выкарыстанні ліку назоўнікаў нямецкай і беларускай моў нярэдка назіраецца пэўная неадпаведнасць. І нават, калі згодна з нормамі беларускай мовы, існуе адпаведнік у адзіночным або множным ліку, перакладчыкі нярэдка карыстаюцца пэўнымі трансфармацыямі. Так, У. Чапега ў перакладзе навелы „Амок” Ш. Цвэйга карыстаецца наступнай трансфармацыяй – заменай множнага ліку нямецкага назоўніка на адзіночны ў беларускім, напрыклад:

| | |
|---|---|
| *Unten fühlte ich* ***die Wasser*** (мн. лік) *leise rauschen* [2, с. 78] (Наш даслоўны пераклад: *Унізе я чуў, як ціхенька шумяць воды*) | *Унізе я адчуваў ціхае журчанне* ***вады*** (адз. лік) [3, с. 151]. |

Слова *вада* ўжыта ў перакладзе ў словазлучэнні *журчанне вады.* У такім выпадку ўжыванне множнага ліку было б недарэчным. Але ў перакладзе У. Чапегі мы сустракаем больш трансфармацый іншага тыпу – замен адзіночнага ліку множным, напрыклад:

| | |
|---|---|
| *...und ich fühlte* ***alle Qual*** (адз. лік ‘пакута, мука’) *des besiegten Elements* [2, с. 78] | *... і я адчуваў* ***усе мукі*** (мн. лік) *пераможанай стыхіі* [3, с. 150]. |

У наступным сказе нямецкі назоўнік *das Streiten* утвораны ад аднайменнага інфінітыва (неазначальнай формы) дзеяслова *streiten* (спрачацца, сварыцца) і перакладаецца як „сварка, спрэчка”, але ў значэнні працэсу. Але такі пераклад будзе неадэкватным, бо беларускі аналаг гэтага слова не мае значэння працэсу, які цягнецца пэўны час, а ўспрымаецца як факт:

| | |
|---|---|
| *...**das** polternde* ***Streiten*** (адз. лік) *zweier nachbarlicher holländischer Offiziere ärgerte nicht mehr.* [2, с. 76] | *...і не злавалі вечныя* ***спрэчкі*** (мн. лік) *двух галандскіх афіцэраў, маіх суседзяў.* [3, с. 149]. |

Тую ж з’яву назіраем у наступным прыкладзе:

| | |
|---|---|
| *Nun, nun zum ersten Male, seit ich die Planken betreten, überkam mich* | *Толькі цяпер, упершыню пасля таго, як я ступіў на сходні, я адчуў* |

| | |
|---|---|
| *die heilige Lust* ***des Träumens*** (адз. лік) [2, с. 77] | *свяшчэнную радасць* ***мараў*** (мн. лік) [3, с. 150]. |

Дзеяслоў *träumen* мае два значэнні: ‘бачыць у сне, прысніць’ і ‘марыць, мроіць’. Слова *das Träumen* можна было б перакласці як „мара“ (але як працэс, працэс бачання мары ў сне). У перакладзе У. Чапегу ўдалося менавіта множным лікам паказаць гэты працэс і такім чынам захаваць неабходны сэнс.

Нярэдка марфалагічныя трансфармацыі сустракаюцца ў комплексе з іншымі відамі трансфармацый, напрыклад, лексічнай*:*

| | |
|---|---|
| *während des Kohlenladens und der Löschung* ***der Fracht*** (адз.лік) [2, с. 74] | *пры пагрузцы вугалю і выгрузцы* ***тавараў*** (мн. лік) [3, с. 147]. |

Слова *die Fracht* ‘груз, фрахт’ можа выкарыстоўвацца ў адзіночным ліку. Але са стылістычнага боку гледжання такое выкарыстанне не ўласціва мастацкаму стылю, таму перакладчык звярнуўся да замены яго больш нейтральным словам *тавар*, ужытым у множным ліку. Такім чынам, адбылася як лексічная, так і марфалагічная трансфармацыя (комплексная трансфармацыя). Вось яшчэ некалькі прыкладаў комплекснай (лексіка-марфалагічнай трансфармацыі):

| | |
|---|---|
| *Das zwitschernde Geschäker der Frauen, das rastlos kreisende Wandern* ***auf dem Engpaß*** (адз. лік) *des Decks* [2, с. 75] | *шчабятанне і траскатня жанчын, пастаяннае кружэнне* ***па цесных завулках*** (мн.лік) *палубы* [3, с. 148]. |

Значэнне *auf dem Engpaß* ‘на вузкім месцы, на цясніне’ было б ненатуральным з пункту гледжання семантыкі і стылю тэкста.

| | |
|---|---|
| *Ich wollte schlafen, träumen und doch nicht weg aus dieser* ***Magie*** (адз. лік)*, nicht hinab in meinen Sarg* [2, с. 78] | *Мне хацелася спаць, марыць, але шкада было развітвацца з гэтымі* ***чарамі*** (мн. лік)*, спускацца ў сваю магілу.* [3, с. 151]. |

Выраз з арыгінальнага тэксту *und doch nicht weg aus dieser Magie* літаральна перакладаецца як „але не збегчы з гэтай магіі“. Замена адзіночнага ліку на множны і адначасовая лексічная трансфармацыя назоўнікаў, зробленыя У. Чапегам, далі магчымасць зрабіць адэкватны пераклад.

Ва ўстойлівых выразах, якія змяшчаюць назоўнік, таксама сустракаюцца трансфармацыі, звязаныя з заменай ліку:

| | |
|---|---|
| *Gerade aber* ***zu Häupten*** *stand mir das magische Sternbild, das Südkreuz* [2, с. 77] | *Над самаю* ***галавою*** *стаяла таямнічае сузор'е Паўднёвага Крыжа* [3, с. 149]. |

Існуе адназначны пераклад на рускую мову выраза *zu Häupten* – „в головах“[4]. З рускай мовы *в головах (в изголовье)* перакладаецца на

беларускую як „у галавах“ [5], дзе назіраем супадзенне ліку ў дзвюх, нават трох мовах (нямецкай, рускай, беларускай). Але так, карыстаючыся комплекснай лексіка-марфалагічнай заменай, перакладчык пазбягае двухсэнсоўнасці.

Адзначым таксама існаванне ў перакладах замен адзіночналікавых нямецкіх назоўнікаў (так званыя *singularia tantum*) на множналікавыя (*pluralia tantum*) у беларускім перакладзе. Так, напрыклад, нямецкае мнагазначнае слова *Brust* можа мець як адзіночны, так і множны лік, але у наступным словазлучэнні *mit atmender Brust* яно ўжыта ў значэнні ‘пярэдняя частка тулава’ [6] – значэнне, якое не мае множнага ліку, што адпавядае беларускаму множналікаваму назоўніку *грудзі:*

| | |
|---|---|
| *...indes nur das Schiff Bewegung schuf, das leise bebend sich* ***mit atmender Brust*** *nieder und auf, nieder und auf, ein gigantischer Schwimmer, durch die dunklen Wogen stieß* [2, с. 77] | *...хоць рух гэты быў выкліканы толькі ходам карабля, плыўца-волата, які з лёгкім дрыжаннем дыхаў* ***на поўныя грудзі****, то падымаўся, то апускаўся і падаваўся наперад, рассякаючы цёмныя хвалі* [3, с. 150]. |

Неабходна адзначыць, што перакладчыкам выкарыстана комплексная трансфармацыя: не толькі замена ліку, але і няўстойлівага выразу з нямецкай мовы *mit atmender Brust* на ўстойлівы выраз у беларускай мове *дыхаць на поўныя грудзі* (ням. *mit voller Brust atmen*), дзякуючы чаму мова перакладу толькі набывае ў “мастацкасці”.

Аднак перакладчыцкія трансфармацыі, звязаныя з заменай ліку, не заўсёды дакладна перадаюць сэнс арыгінальнага тэксту. Разгледзім прыклады, дзе ў перакладзе не захоўваецца перадача катэгорыі ліку:

| | |
|---|---|
| *Unwillkürlich ertastete ich mit meinem Fuß unter mir ein Bündel* ***Taue*** (мн. лік) [2, с. 78] | *Неўсвядомлена я намацаў нагою бухту* ***каната*** (адз.лік) [3, с. 151]. |

У нямецкім словазлучэнні *ein Bündel Taue* (‘звязка канатаў’ – мн.лік) У. Чапегам у перакладзе ў комплексе з лексічнай заменай праводзіцца частковая марфалагічная трансфармацыя – замена множнага ліку на адзіночны: *бухта каната.* Такі пераклад прыводзіць да пэўных страт у больш дэталёвым разуменні сэнсу.

| | |
|---|---|
| *Und wie ich den Blick aufhob über den dünstenden Turm des Schornsteins und* ***die*** *geisterhaft* ***glänzenden Spieren*** (мн. лік)*, drang mit einmal magische Helle mir in die Augen* [2, с. 76] | *І* калі *я скіраваў позірк паверх дымнай вежы трубы і прывідна* ***мігатлівага рангоўта*** (адз. лік)*, у вочы раптам ударыла яркае святло* [3, с. 149]. |

Назоўнік *die Spiere* ‘бушпрыт; мачта’ ужываецца ў нямецкім сказе ў множным ліку – *die geisterhaft glänzenden Spieren* ‘прывідна бліскучыя мачты/бушпрыты’, што ўплывае на семантычнае значэнне: адразу ўзнікае адчуванне, што гаворка ідзе пра вялікі параход, на якім адбываецца галоўнае дзеянне твора. У беларускім перакладзе значэнне множнасці абагульняецца словам, ужытым у адзіночным ліку, *рангоўт,* ‘агульнай назвай прылад для пад’ёму і расцягвання парусоў (да рангоўта адносяцца мачты, рэі, бушпрыт і т.п.)’[7], з-за чаго пераклад атрымліваецца меньш дэталёвым і губляе дадатковыя адценні сэнсу.

Такім чынам, аналіз прыкладаў паказвае, што катэгорыя ліку – гэта, у першую чаргу, катэгорыя іменная, як у нямецкай, так і ў беларускай мове. Лік назоўнікаў у нямецкай і беларускай мовах у асноўным супадае. У выкарыстанні ліку назоўнікаў нямецкай і беларускай моў нярэдка назіраецца пэўная неадпаведнасць, выкліканая пэўнай аддаленасцю няроднасных моў, што прыводзіць да трансфармацый (у асноўным замен рознага тыпу) пры перакладзе.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Зеленецкий, А.Л. Теория немецкого языкознания: учеб. пособие для студ. лингв. ун-тов и фак. ин. яз. высш. пед. учеб. заведений / А.Л. Зеленецкий, О.В. Новожилова. – М. : Издательский центр “Академия”, 2003. – 400 с.
2. Zweig, St. Der Amokläufer und andere Erzählungen / St. Zweig. – Frankfurt am Main : S. Fischer Verlag GmbH, 1984. – 208 S.
3. Цвэйг, Шт. Пякучая таямніца. Навелы / Шт. Цвэйг. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1994. – 496 с.
4. Немецко-русский (основной) словарь / К. Лейн [и др.] ; под общ. ред. К. Лейна. – М. : Рус. яз., 1992. – 1040 с.
5. Русско-белорусский словарь : в 3 т. / НАН Беларуси, Ин-т языкознания ; под ред. К. Крапивы и П. Глебки. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск : БелЭН, 1993. – 1 т. – 800 с.
6. Duden-Bibliothek [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://de.binarydb.com/soft/Duden_-_Bibliothek-v119907.html. – Дата доступу : 15.03.2017.
7. Википедия – свободная энциклопедия [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступу : 17.03.2017.